## Акцыя “Наш паклон вам, ветэраны!”

У напярэдадні 9 Мая такія словы гучалі ў адрас ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны - Сарока Эдуарда Антонавіча, Мягковай Таццяны Сцяпанаўны, Шагидевича Бранiслава Iванавiча, Бралковского Станiслава Юльянавiч, Заблоцкага Казiмiра Iванавiча, Лашкевiча Уладзiмiра Уладзiмiравiча. Словы віншавання і падзякі ветэранам выказалі дырэктар ДУ "Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна», спецыялісты аддзялення сацыяльнай дапамогі дома і аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў, валанцёры БРСМ.

Падчас віншаванняў госці стараліся надаць увагу людзям, якія прайшлі выпрабаванні франтавымі і партызанскімі дарогамі. У кожнага пацікавіліся здароўем, самаадчуваннем, кожнаму падабралі душэўныя словы. Таму абстаноўка была сяброўскай і сардэчнай. Ветэраны расчуліліся ад шчырага увагі, разгаварыліся, падзяліліся ўспамінамі пра гады ліхалецця, салдацкія будні, пра тое, якія незабыўныя хвіліны шчасця перажажылі, пачуўшы доўгачаканае: «Перамога!» І сваім ўдзячным слухачам пажадалі: «Няхай заўсёды будзе мірнае неба над нашай роднай Беларуссю!».Свае музычныя віншаванні ветэранам падарылі вучні і педагог ДУА «Ашмянская дзіцячая школа мастацтваў».




